**Дэманстрацыйны варыянт**
**рэспубліканскай кантрольнай работы**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**
*(VIII клас; 2025/2026 навучальны год)*[1]

## Інструкцыя для вучня

На выкананне рэспубліканскай кантрольнай работы адводзіцца **45** хвілін. Выконваць заданні можна ў любым парадку. Калі не ведаеце, як выканаць заданне, прапусціце яго і пераходзьце да наступнага. Пры наяўнасці часу пасля выканання ўсёй работы можна вярнуцца да прапушчаных заданняў.

Пры выкананні работы не дазваляецца карыстацца сродкамі захавання і перадачы інфармацыі (вучэбнымі дапаможнікамі, рабочымі сшыткамі, слоўнікамі, электроннымі прыладамі).

Адказы на заданні акуратна, разборліва запісваюцца ў «Бланку адказаў» справа ад нумара адпаведнага задання.

Перш чым здаць «Бланк адказаў» упэўніцеся, што перанесены ўсе неабходныя адказы з чарнавіка.

Жадаем поспехаў!

**Заданне 1. Адзначце два віды сувязі, пры дапамозе якіх сказы могуць быць звязаны ў тэксце.** *Запішыце ў «Бланк адказаў» нумары правільных адказаў (напрыклад: 3, 5).*
1) перпендыкулярная;
2) паслядоўная;
3) асноўная;
4) паралельная;
5) слоўнікавая.

**Заданне 2. Працягніце сцверджанні.** *Запішыце сцверджанні ў «Бланк адказаў».*
1) Тэкст – гэта твор маўлення, які складаецца з... .
2) Акалічнасць – гэта даданы член сказа, які абазначае... .

**Заданні 3–5.**
**Прачытайце тэкст і выканайце заданні 3–5.**

**«Класная» прэм’ера, ці Падарунак усім настаўнікам**

З пачаткам навучальнага года класныя кіраўнікі ўжо задумваюцца, на якія фільмы можна будзе схадзіць усім класам гэтай восенню. І каб доўга шукаць цікавую і карысную карціну не прыйшлося, пра гэта ўжо паклапаціліся беларускія стваральнікі кіно, зрабіўшы шыкоўны падарунак усім настаўнікам да Дня ведаў – гаворка пра доўгачаканую прэм’еру «Класная».

Карціна распавядзе пра выпускніцу БДПУ Таццяну Васілеўскую, якую размеркавалі ў аграгарадок Міжрэчча. У школе дзяўчына стала класнай

[1] © АКАДЭМІЯ АДУКАЦЫІ

АКАДЭМІЯ АДУКАЦЫІ

выпускнога класа. Кожнага з вучняў *(н_)*пакояць праблемныя моманты... *(Н_)*хто з падлеткаў *(н_)*ў якім разе не гатовы прыняць замену сваёй былой любімай класнай, якая была вымушана пайсці на пенсію. Маладой настаўніцы давядзецца пераадолець уласныя сумненні, *(н_)*вопытнасць.

Да прэм'еры «Класную» паказалі журналістам. Здымачная група ахвотна згадвала, як стваралася кіно. Асабліва цяжкімі былі дзве сцэны: самая масавая, дзе бралі ўдзел каля 200 чалавек, і тая, дзе адзін з герояў праваліўся пад лёд (зразумела, яе здымалі з удзелам каскадзёраў пры захаванні ўсіх правілаў бяспекі). Найбольш кранальнымі назвалі адну з фінальных сцэн, дзе завуч школы чытае верш, а таксама танец класнай са сваім калегам, які падтрымліваў яе на працягу ўсёй гісторыі.

*Па матэрыялах газеты «Звязда»*

**Заданне 3. Вызначце, да якога стылю належыць прыведзены тэкст.** *Адказ запішыце ў «Бланк адказаў» (напрыклад: навуковы стыль).*
**Вызначце асаблівасці стылю, да якога належыць прыведзены тэкст. Устанавіце адпаведнасць паміж левым і правым слупкамі табліцы.**
*Адказ запішыце ў «Бланк адказаў» у выглядзе спалучэння літары і адпаведнай лічбы (напрыклад: А2Б4В3Г1Д5). Літары павінны ісці ў алфавітным парадку.*

| | |
|---|---|
| А) характэрныя рысы;<br>Б) сфера выкарыстання;<br>В) лексічныя сродкі;<br>Г) асноўныя жанры;<br>Д) задачы маўлення | 1) паведамленне навін штодзённага жыцця, тлумачэнне грамадска-палітычных пытанняў;<br>2) аператыўнасць і дакладнасць інфармацыі; лагічнасць доказаў;<br>3) нататка, артыкул, водгук, рэпартаж, інтэрв'ю, публічнае выступленне;<br>4) ужыванне абстрактнай і грамадска-палітычнай лексікі;<br>5) сродкі масавай інфармацыі, грамадска-палітычная літаратура, палітычныя выступленні |

**Заданне 4. Спішыце словы з левага слупка, раскрываючы дужкі.** *Адказ запішыце ў «Бланк адказаў».*
**Устанавіце адпаведнасць паміж левым і правым слупкамі табліцы.** *Адказ запішыце ў «Бланк адказаў» у выглядзе спалучэння літары і адпаведнай лічбы (напрыклад: А2Б4В3Г1). Літары павінны ісці ў алфавітным парадку.*

| | |
|---|---|
| А) *(н_)*пакояць<br>Б) *(н_)*ў якім разе<br>В) *(н_)*вопытнасць<br>Г) *(Н_)*хто | 1) *не (ня)* з назоўнікам пішацца разам, калі надае слову новае, супрацьлеглае, значэнне, якое можна патлумачыць сінонімам без *не (ня)*;<br>2) *ні* пішацца асобна з адмоўнымі займеннікамі, калі пасля *ні* ўжываецца прыназоўнік;<br>3) слова без *не (ня)* не ўжываецца;<br>4) *не (ня)* з поўнымі дзеепрыметнікамі пішацца разам, калі пры іх няма паясняльных слоў; |

АКАДЭМІЯ АДУКАЦЫІ

| | |
|---|---|
| | 5) з адмоўнымі займеннікамі<br>і прыслоўямі *ні* пішацца разам |

**Заданне 5. Раскажыце пра свой любімы фільм.** *Складзіце і запішыце ў «Бланк адказаў» тэкст-апісанне з 5–7 сказаў. Дайце тэксту загаловак.*

**Пры адказе выкарыстайце:**

- просты сказ з састаўным дзеяслоўным выказнікам;
- просты сказ, ускладнены аднароднымі членамі;
- просты аднасастаўны сказ.

АКАДЭМІЯ АДУКАЦЫІ